27.07.2018 / 21:51 27

Што вядома пра беларусаў, якіх украінскія спецслужбы назвалі наймітамі

СБУ заявіла, што ідэнтыфікавала асобы 206 наймітаў расійскай ПВК Вагнера, якія бралі ўдзел у ваенных дзеяннях у Сірыі ў лютым гэтага года. Сцвярджаецца, што сярод іх — 11 беларусаў, імёны і фота шасці



Ілюстрацыя: СБУ.

Руслан Бабінін

У спісе СБУ згаданы 51-гадовы мінчук Руслан Бабінін. Служба адзначае, што гэты ж чалавек у 2003 годзе быў у сюжэце канала «Расія 1» аб байцах Французскага

Скрыншот праграмы «Спецыяльны рэпарцёр» на «Расія 1».

На той момант мужчына служыў у легіёне 6 гадоў, паводле яго слоў, кіроўцам у інжынерных войсках. Але збіраўся неўзабаве мяняць працу і дзяліўся марай: купіць мікрааўтобус і вазіць турыстаў па Блакітным бярозе

Калегі з такім жа імем памятаюць выпускніка 1991 года з Вышэйшага вайскова-палітычнага авіяцыйнага вучылішча ў горадзе Кургане (Расія). Згадвалі, што Руслан Бабінін з чацвёртай роты (называлі яшчэ «Боб») пераехаў у Францыю, служыць у легіёне. Мабыць, гаворка пра таго ж самага чалавека.

У сеціве ёсць некалькі старонак Руслана Бабініна (той жа чалавек з сюжэта); дата нараджэння і адукацыя супадаюць. Там ён пазначыў, што жыве ў Парыжы, а з 2006 года працуе прадпрымальнікам у сферы турызму. Большасць сяброў і здымкаў — з Францыі, хоць пару тыдняў таму паведамляў пра сваё знаходжанне ў Расіі.

У 2000-я гэтага ж чалавека шукаў мужчына, які пазнаў у тэлесюжэце аб

брата. Згадваў, што сам Руслан нарадзіўся ў Грозным у 1967 годзе (дата супадае), потым сям'я жыла ў Алма-Аце (Казахстан), а пасля брат перабраўся з маці ў Беларусь. Па яшчэ адных даных, жанчына па-ранейшаму жыве ў адным з беларускіх абласных цэнтраў.

На паведамленні Tut.by ні Бабінін, ні яго маці не адказалі.

Эдвард Давыдаў

У спісе СБУ — 27-гадовы ўраджэнец горада Іванава Эдвард Давыдаў. Як паведамляе ўкраінскі партал «Міратворац», Эдвард Давыдаў —

расійскай ПВК (прыватнай вайсковай кампаніі)». Аднак доказаў яго ўдзелу ў баявых дзеяннях у Сірыі спецслужба не падала.

Эдвард Давыдаў. Фота: vk.com/id71751850.

Эдвард Давыдаў нарадзіўся і вырас у Іванаве, у 2008 годзе скончыў мясцовую сярэднюю школу.

— Яго выхоўвала маці, — распавёў сябар дзяцінства Юрый і дадаў, што пасля заканчэння школы хлопец застаўся сіратой, братоў і сясцёр у яго таксама не было.

Пасля школы Эдвард сышоў у войска. Службу праходзіў у Слоніме. Былыя калегі пра яго адгукаюцца станоўча.

— Пазітыўны пафігіст, — распавёў былы калега Максім.

Пасля войска Эдвард з'ехаў у Расію працаваць «на будаўнічых шабашках». Перыядычна прыязджаў на радзіму да сяброў. Па словах знаёмых, Давыдаў апошні раз прыязджаў на малую радзіму каля чатырох месяцаў таму.

Сябры характарызуюць яго як «адэкватнага» і «спакойнага» чалавека. Навіны пра яго ўдзел у вайне ў Сірыі або канфлікце на ўсходзе Украіны яны ўспрынялі са здзіўленнем.

На старонцы Эдварда ў сацсетках горадам пражывання названая Масква. Апошні допіс датуецца сакавіком 2013 года. У альбомах знаходзяцца фатаграфіі са службы, работы і сустрэч з сябрамі. Звязацца з ім не атрымалася.

Сяргей Сазанаў

Сяргей Сазанаў. Фота: Іван Ярыванавіч, Tut.by.

Сазанаў — былы міліцыянт. Падчас службы не аднойчы атрымліваў званні «Найлепшы супрацоўнік міліцыі», раскрыў дзясяткі крымінальных спраў, у 90-я асабіста затрымліваў асабліва небяспечных удзельнікаў злачынных груповак. Пра гэта шмат разоў пісалі

чалавека, вось — выцягнуў з вады дзяўчынку, якая танула, потым — яшчэ трох чалавек… Але пасля 17 гадоў службы Сяргей нечакана для ўсіх сышоў з органаў. Кажа, што «не захацеў больш быць у сістэме».

Затым у лёсе былога міліцыянта пачалі адбывацца дзіўныя падзеі. Падрабязнасцей Сазанаў не расказваў. Казаў толькі адно: супраць яго ў роднай Рэчыцы нібыта арганізавана цкаванне, маўляў, не мог нават уладкавацца на працу.

Гэта ж праз два гады нам расказаў і яго знаёмы.

У Сяргея Сазанава ёсць старонка ў

абнаўлялася на працягу некалькіх гадоў. 27 ліпеня звязацца з ім не ўдалося.

Вадзім Юшкевіч і Канстанцін Гірс

Вадзіму Юшкевічу 37 гадоў, скончыў школу ў Наваполацку, Акадэмію МУС Беларусі.

Вадзім спартыўны, цікавіцца футболам, хакеем, экстрэмальнымі відамі спорту.

Аднак апошні раз у сацыяльных сетках ён быў некалькі гадоў таму.



Мужчына зарэгістраваны на адным з расійскіх сайтаў знаёмстваў — там напісана, што жыве ён у Данецку, Украіна.

32-гадовы Канстанцін Гірс у войску служыў у ПДВ. На асабістай старонцы ў сацыяльнай сетцы шмат відэа, прысвечаных гэтаму роду войскаў, а таксама вулічным рукапашным баям.

Гэта фота Канстанцін Гірс загрузіў у 2015 годзе. Фота: vk.com.

Быў індывідуальным прадпрымальнікам. У якасці ІП быў зарэгістраваны ў Наваполацку. У лютым 2016 го структура знаходзілася ў працэсе ліквідацыі. Прадпрымальніцкая дзейнасць не ажыццяўлялася на працягу 12 месяцаў

Чалавек, які адказвае ў сацсетках як Канстанцін Гірс, адмовіўся размаўляць з карэспандэнтам.

Знайсці інфармацыю пра Аляксандра Ступніцкага не ўдалося.

Tut.by

Хочаш падзяліцца важнай інфармацыяй ананімна і канфідэнцыйна?

Пішыце рэдактару «Нашай Нівы» ў ТГ

ЧЫТАЙЦЕ ЯШЧЭ

Уначы ў Мінску сутыкнуліся машына з матацыклам, матацыкліст стаў калекам 4

Пад Смалявічамі 10-гадовы хлопчык застаўся без часткі пальца з-за цікаўнасці 2

Беларус паспрабаваў даць латвійскай памежніцы хабар у 5 еўра 4

КАМЕНТАРЫ

КАМЕНТАВАЦЬ

ІМЯ

Націсканьне кнопкі «Дадаць каментар» азначае згоду з рэкамендацыямі па абмеркаванні.

Спам-фільтр: падлічыце, колькі будзе...

5+27+3= не бачу сімвалы

ДАДАЦЬ КАМЕНТАР

«Да чаго Лукашэнка Беларусь давёў». Расейцы і амерыканцы ў захапленні ад крамы на ўскраіне Мінска 10

У Гродне п'яны мужчына зладзіў майстар-клас па стральбе проста на дзіцячай пляцоўцы

Сеў Леніну на галаву. З аграсядзібы пад Маладзечнам збег бусел і паляцеў у горад гарэзнічаць 2

Камароўку абнаўляюць. Вось як змянілася культавае месца 2

На станцыі метро «Партызанская» адбыўся інцыдэнт з пасажырам

Суд у Круглым другі раз асудзіў Аліну Гораву: ёй далі паўтара года хатняй хіміі

Прэзідэнт Экватарыяльнай Гвінеі пабачыў у беларусах братні народ

У галоўнага маскоўскага Z-патрыёта знайшлася кватэра ў Іспаніі. Дапамогу ў пошуках аказала сабака сям'і 2

Такое рознае лета. Сіноптыкі расказалі пра адметнасці гэтай пары года ў Беларусі

ГУБАЗіК затрымаў яшчэ аднаго праграміста. За тое, што ён «няправільна адказаў па тэлефоне» 2

Вользе Карач адмовілі ў кампенсацыі маральнай шкоды за нясвоечасовую адмову ў прытулку

У Расонах з'явіўся мурал з каласамі, валошкамі і буслами 1

British American Tobacco прадала бізнэс у Беларусі і РФ 2

У Мінску адбылася аварыя на водаправодзе. Усё

Вядомае і многімі любімае віно Прасека можа цалкам знікнуць

ваду з крана піць нельга

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Даляр узяў чарговую планку

Беларусбанк у Слуцку ўпрыгожылі выявамі слуцкіх паясоў 1

Сілавікі затрымалі праграміста пасля таго, як ён «адказаў у грубай форме і паклаў слухаўку» 4

У мірны час мін на мяжы з Беларуссю не будзе — камандуючы Нацыянальнымі сіламі Латвіі

Польскі дэпутат: Абавязкова знойдзецца рашэнне, каб беларусы маглі заставацца ў

Сёння ў Мінску адкрываецца «Восеньскі салон»

Напаміны Duolingo робяцца ўсё больш агрэсіўнымі

«Расіяне павінны баяцца»: Лайма Вайкуле «прадказвае» вайну на тэрыторыі РФ

Цэны растуць, а колькасць здзелак набліжаецца да рэкорду. Што адбываецца на рынку жылля і як новы ўказ Лукашэнкі адаб'ецца на ім 1

Камандзіра арміі СПА, якая абараняе Маскву, арыштавалі за хабар 2

СТУЖКА НАВІН

КАЛЯНДАР



Жнівень **Верасень** Кастрычнік

ПН	АЎ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НД
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	

PDF ВЕРСІЯ



Навіны

Улада
Выбары-2020
Эканоміка
Грамадства
Здарэнні
Свет
Спорт
Аўто
Меркаванні
Ад рэдакцыі
Архіў

Культура

Гісторыя
Афіша
Музыка
Мова
Кіно
Літаратура
Культура
Тэатр

Навука і тэхналогіі

Спорт

Каханне і сэкс

Здарэнні

Здароўе

КАНТАКТЫ

Дызайн сайта — арт-студыя PRAS

© Усе правы абароненыя. Выкарыстанне платных матэрыялаў забаронена без пісьмовага дазволу. Выкарыстанне бясплатных рускамоўных версій матэрыялаў забаронена без пісьмовага дазволу. Выкарыстанне бясплатных беларускамоўных версій матэрыялаў дазваляецца пры ўмове наяўнасці актыўнай гіперспасылкі на Nashaniva.com у першым абзацы.